# No. 52468*

## Belarus
## and
## Ukraine

**Treaty between the Republic of Belarus and Ukraine on State Boundary (with maps and protocol). Kiev, 12 May 1997**

**Entry into force:** *18 June 2013 by the exchange of the instruments of ratification, in accordance with article 7*

**Authentic texts:** *Belarusian and Ukrainian*

**Registration with the Secretariat of the United Nations:** *Belarus, 1 January 2015*

*No UNTS volume number has yet been determined for this record. The Text(s) reproduced below, if attached, are the authentic texts of the agreement /action attachment as submitted for registration and publication to the Secretariat. For ease of reference they were sequentially paginated. Translations, if attached, are not final and are provided for information only.*

## Bélarus
## et
## Ukraine

**Traité entre la République du Bélarus et l'Ukraine sur la frontière d'état (avec cartes et protocole). Kiev, 12 mai 1997**

**Entrée en vigueur :** *18 juin 2013 par l'échange des instruments de ratification, conformément à l'article 7*

**Textes authentiques :** *biélorusse et ukrainien*

**Enregistrement auprès du Secrétariat de l'Organisation des Nations Unies :** *Bélarus, 1er janvier 2015*

*Aucun numéro de volume n'a encore été attribué à ce dossier. Les textes disponibles qui sont reproduits ci-dessous sont les textes originaux de l'accord ou de l'action tels que soumis pour enregistrement. Par souci de clarté, leurs pages ont été numérotées. Les traductions qui accompagnent ces textes ne sont pas définitives et sont fournies uniquement à titre d'information.*

[ BELARUSIAN TEXT – TEXTE BIÉLORUSSE ]

# ДАГАВОР

## паміж Рэспублікай Беларусь і Украінай аб дзяржаўнай граніцы

Рэспубліка Беларусь і Украіна, якія далей называюцца "Дагаворныя Бакі",

зыходзячы з прынцыпаў суверэннай роўнасці, тэрытарыяльнай цэласнасці дзяржаў і непарушнасці граніц,

кіруючыся мэтамі і прынцыпамі Статута Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, палажэннямі Хельсінкскага Заключнага акта і іншых дакументаў Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе,

грунтуючыся на палажэннях Дагавора аб дружбе, добрасуседстве і супрацоўніцтве паміж Рэспублікай Беларусь і Украінай ад 17 ліпеня 1995 года,

паважаючы волю народаў Рэспублікі Беларусь і Украіны да далейшага развіцця дружалюбных, добрасуседскіх адносін,

жадаючы ўсталяваць дзяржаўную граніцу паміж Рэспублікай Беларусь і Украінай,

дамовіліся аб ніжэйпададзеным:

### Артыкул 1

Усталяваць дзяржаўную граніцу паміж Рэспублікай Беларусь і Украінай згодна з дакументамі, што з'яўляюцца неад'емнай часткай гэтага Дагавора:

1. Пратаколам-апісаннем пралягання лініі дзяржаўнай граніцы паміж Рэспублікай Беларусь і Украінай.
2. Альбомам тапаграфічных карт з графічна нанесенай на іх лініяй дзяржаўнай граніцы.

### Артыкул 2

Дзяржаўная граніца ёсць лінія і вертыкальная паверхня, што па гэтай лініі праходзіць, якія вызначаюць мяжу тэрыторый Дагаворных Бакоў - сушы, водаў, нетраў, паветранай прасторы.

**Артыкул 3**

Дэмаркацыя дзяржаўнай граніцы паміж Дагаворнымі Бакамі ажыццяўляецца Сумеснай камісіяй.

Сумесная камісія праводзіць сваю дзейнасць на падставе Палажэння аб дэмаркацыі дзяржаўнай граніцы, якое зацвярджаецца ўрадамі Дагаворных Бакоў.

**Артыкул 4**

Рэжым дзяржаўнай граніцы паміж Рэспублікай Беларусь і Украінай вызначаецца асобным дагаворам.

Парадак карыстання зямельнымі ўчасткамі, якія размешчаны за лініяй дзяржаўнай граніцы, але знаходзяцца ў карыстанні суб'ектаў гаспадарання другога Дагаворнага Боку, вызначаецца асобным пагадненнем.

**Артыкул 5**

Дагаворныя Бакі абменьваюцца тапаграфічна-геадэзічнымі звесткамі, картаграфічнымі і аэрафотаздымнымі матэрыяламі з грыфам "Сакрэтна", неабходнымі для падрыхтоўкі дакументаў дэлімітацыі, дэмаркацыі, праверкі пралягання дзяржаўнай граніцы, і забяспечваюць ахову гэтых даных і матэрыялаў у адпаведнасці з дзеючымі паміж Дагаворнымі Бакамі пагадненнямі.

**Артыкул 6**

Выдаткі, звязаныя з дэмаркацыяй дзяржаўнай граніцы, Дагаворныя Бакі нясуць паасобку.

**Артыкул 7**

Гэты Дагавор з'яўляецца бестэрміновым.

Гэты Дагавор падлягае ратыфікацыі і ўступае ў сілу з моманту абмену ратыфікацыйнымі граматамі, які адбудзецца ў г. Мінску______.

Здзейснена ў г.__Кіеве______, "12" ____мая_____ 1997 года ў двух экземплярах, кожны на беларускай і украінскай мовах, прычым абодва тэксты аўтэнтычныя.

**ЗА РЭСПУБЛІКУ БЕЛАРУСЬ**

**ЗА УКРАІНУ**

[ RUSSIAN TEXT – TEXTE RUSSE ]

# ПРАТАКОЛ - АПІСАННЕ

## праходжання дзяржаўнай граніцы паміж

## РЭСПУБЛІКАЙ БЕЛАРУСЬ
## і
## УКРАІНАЙ

Да Дагавору паміж Республікай Беларусь і Украінай
аб дзяржаўнай граніцы

| За Рэспубліку Беларусь | За Україну |
|---|---|
| [signature] | [signature] |
| 12 мая 1997 г. | 12 травня 1997 р. |

Сумесная беларуска - украінская камісія па правядзенні
дэлімітацыі і дэмаркацыі дзяржаўнай граніцы

Спільна білорусько - українська комісія з проведення
делімітації і демаркації державного кордону

**1997**

# ПРОТОКОЛ - ОПИС

## проходження державного кордону між

## РЕСПУБЛІКОЮ БІЛОРУСЬ
## та
## УКРАЇНОЮ

**До Договору між Республікою Білорусь та Україною**
**про державний кордон**

| За Рэспубліку Беларусь | За Україну |
| --- | --- |
| | |
| *12 мая* 1997 г. | *12 травня* 1997 р. |

**Спільна білорусько - українська комісія з проведення**
**делімітації і демаркації державного кордону**

**1997**